**Бурак І.Л. (Мінск)**

## Функцыі знакаў прыпынку ў мастацкім тэксце (на матэрыяле твораў Максіма Танка)

Асноўнымі функцыямі знакаў прыпынку ў сучаснай беларускай літаратурнай мове з’яўляюцца функцыя раздзялення і функцыя выдзялення. Сэнс функцыі раздзялення заключаецца ў тым, што знакі прыпынку раздзяляюць асобныя сказы ў тэксце, прэдыкатыўныя часткі складаных сказаў, аднародныя члены ў сказе, а таксама параўнальныя звароты, звароткі, адасобленыя члены сказа: *Пра кожнае дрэва і камень я ведаю столькі паданняў; пра кожную ў полі былінку ці голас птушыны ў бары, пра золакі ціхія, летнія поўдні, змярканні бясконцыя мог бы паэмы складаць, гаварыць.* [1, с. 38]; *Як блізка і далёка ты, радзіма!* [1, с. 110]

Сэнс функцыі выдзялення заключаецца ў тым, што знакі прыпынку выдзяляюць параўнальныя звароты, звароткі, адасобленыя члены сказа, пабочныя словы, якія размешчаны ў сярэдзіне сказа, а таксама ўстаўныя канструкцыі і простую мову: *Народ пранясе цябе, родная мова, святлом незгасальным у сэрцы сваім* [1, с. 125].

Акрамя гэтых найважнейшых функцый, вылучаюцца яшчэ функцыі замяшчэння, папярэджання і размеркавання [2, с. 81].

Функцыя замяшчэння не існуе асобна, а накладаецца, як правіла, на раздзяляльную функцыю: *Бор сасновы, цемнагрывы, а за борам – сіні Нёман, а за ім – чатыры нівы, дзе ў зялёных пералівах несціханы шум і гоман* [1, с. 8]. У дадзеным прыкладзе працяжнік раздзяляе часткі простага сказа, адначасова ўказваючы на пропуск дзеяслова-выказніка.

Сэнс функцыі папярэджання заключаецца ў тым, што некаторыя знакі прыпынку сігналізуюць аб наяўнасці пэўнай сінтаксічнай канструкцыі ў сказе. Напрыклад, дужкі ў сказе ўказваюць на наяўнасць устаўной канструкцыі; двукоссе – на наяўнасць простай мовы; двукроп’е – на складаны бяззлучнікавы сказ з адносінамі паяснення або прычыны ці на наяўнасць абагульняльнага слова пры аднародных членах; знакі прыпынку ў канцы сказа ўказваюць на заканчэнне гэтага сказа: *Але круты кахання шлях: да яблынькі адна дзяўчына прыйшла аднойчы і ў слязах прыпала да яе галінаў* [1, с. 15]; *“Няхай яшчэ дрэвы малыя, – пісалі нам нашы сябры, – і птушак у засень не могуць яшчэ іх прывабіць шатры, але каб птушыныя статі ляцелі гняздзіцца хутчэй, шпакоўняў мы шмат збудавалі для нашых жаданых гасцей”* [1, с. 11]; *Нібы мурашкі, баржы на буксіры (адна “Цырцэя”, а другая “Ліра”) наш цягнуць велізарны цеплаход* [1, с. 126]. Коска такой функцыяй не валодае, бо, не прачытаўшы сказ, немагчыма дакладна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызначыць, раздзяляльным ці выдзяляльным знакам прыпынку яна з'яўляецца.

Функцыю размеркавання выконваюць знакі прыпынку, якія ў комплексе ажыццяўляюць графічнае чляненне тэксту, змацаваны агульнай схемай і ўтвараюць пунктуацыйны комплекс. Напрыклад, знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльным словам або знакі прыпынку пры простай мове: *Ціха крыніца плыве, у чыстай яе сіняве ўсё знайшло адлюстраванне: травы і лісце ракіт, сонца пагожага рання, хмары і скалаў граніт…* [1, с. 14]; *Як не слухаць ёй гоману ў палях, пераздвону хваль, песень салаўя, што гавораць ёй неба і зямля, голас мілага: "Зорка ты мая…"* [1, с. 45].

Пералічаныя функцыі ўласцівыя знакам прыпынку ва ўсіх стылях мовы. Акрамя таго, у мастацкім тэксце некаторыя знакі прыпынку могуць набываць і іншыя функцыі. Так, кропка можа разрываць граматычную структуру сказа, ствараючы пэўныя сэнсавыя і інтанацыйныя акцэнты ў выказванні пры парцэляцыі. Расчляненне выказвання на часткі адпаведна іх сэнсавай значнасці дапамагае перадаць інтанацыі і акцэнтаванасць жывога маўлення. Групы слоў, адарваныя ад асобнага сказа, набываюць самастойнасць асобнага выказвання, з іх дапамогай вылучаюцца найбольш важныя моманты ў паведамленні. Кожны з наступных элементаў выказвання як бы ўзнікае ў свядомасці не адразу, а ў працэсе роздуму. Думка ў паведамленні падаецца асобнымі порцыямі, што стварае перарывістасць інтанацыі і імітуе натуральнасць і непасрэднаць жывога маўлення: *"Ну, хто там?" – пытаю. І яблыню бачу* [1, с. 68]; *Пусты небасхіл. Хоць маліся, хоць плач ты* [1, с. 102]; *Знаю я, што Зямля – нівы, горы, лясы, акіяны – калышацца ў сетцы густой паралеляў і мерыдыянаў, падвешаная да Палярнай Звязды ці да Месяца. Паэтычна. Што ні кажы* [1, с. 504].

У паэтычных радках Максіма Танка парцэляцыя сустракаецца не часта.

Шматкроп'е абазначае не толькі незавершанасць выказвання, замінкі ў маўленні. Яно ўказвае на глыбокі падтэкст і таму часта выкарыстоўваецца пры пунктуацыйным афармленні загалоўкаў. Максім Танк актыўна ўжывае шматкроп'е ў загалоўках вершаў. Даволі часта назвай верша становіцца першы яго радок або яго частка: "Я знаю забыты вятрамі…" [1, с. 148], "Здаецца, мы вачэй людскіх…" [1, с. 157], "Быццам па няроўнай…" [1, с. 202]. У вершах М. Танка шматкроп'е ўжываецца як знак эмацыянальнага і інтэлектуальнага напружання: "*А ты мяне клічаш, каб я ўсё кідаў, прыязджаў, што звоняць з рэдакцый, артыкулаў, вершаў чакаюць…* [1, с. 69] *Для мірнай песні прастор шырокі. І пагранічнік адкрыў шлагбаум…* [1, с. 95]; *Ты смяешся… Адкажы: можа, гэта мала?* [1, с. 100]. У вершах М.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Танка шматкроп’е перадае няўлоўныя адценні значэнняў, што спрыяе стварэнню глыбіннага псіхалагічнага падтэксту, эмацыянальнай напоўненасці твора. Гэтым тлумачыцца частае ўжыванне шматкроп’я ў вершах М. Танка.

Працяжнік дапамагае перадаць эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку паведамлення. Пры ўзмоцненым адасабленні гэты знак прыпынку актуалізуе сэнс аддзеленага ім кампанента: *Ёсць адзін падарунак – жыццё…*[1, с. 163]; *На лістах малюнкі – іх жывыя мары аб міжзорных дальніх, казачных палётах…* [1, с. 151]. Працяжнік паміж прэдыкатыўнымі часткамі складанага сказа падкрэслівае рэзкую ці нечаканую змену падзей: *А бачылі, як у гаршках закіпае бацвінне ці бульба – і пена шугае?* [1, с. 195]; *Кранаецца ён клавішаў зямлі – і ўдаль плывуць яго накцюрнаў гукі* [1, с. 219]. Такое ўжыванне працяжніка – адна з найбольш характэрных рыс пунктуацыйнага афармлення вершаў Максіма Танка.

Такім чынам, у мастацкім тэксце знакі прыпынку, акрамя функцый, уласцівых гэтым графічным сродкам ва ўсіх стылях пісьмовай формы мовы, могуць набываць і стылістычную функцыю, г.зн. спрыяць павышэнню эмацыянальнасці, экспрэсіўнасці, дапамагаюць больш дакладна перадаць разнастайныя адценні паведамлення.

Літаратура

1. Танк, М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Т. 3 – Мінск, 1979. – 486 с.

2. Шапиро, А.Б. Основы русской пунктуации / А.Б. Шапиро. – М., 1955. – 397 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ